# ПАМЯЦІ ЯЎГЕНА ПЕТРАШЭВІЧА

**Учора ў абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Карскага ў межах праекта "Яны ўзбагачалі культуру Гродзеншчыны" адбыўся вечар памяці вядомага музыканта, кампазітара і самародка-паэта Яўгена Петрашэвіча.**

Сябры, прыхільнікі творчасці, былыя калегі, вучні-"дударыкі" і проста аднадумцы і суседзі, якія шмат гадоў ведалі гэтага таленавітага чалавека, дзяліліся ўспамінамі, узгадвалі яго музычныя творы, моладзь чытала яго вершы, навукоўцы і пісьменнікі акрэслілі значнасць асобы Яўгена Канстанцінавіча ў культуры Гродзеншчыны і Беларусі. Вакальны народны ансамбль "Гармонія" падарыў прысутным песні кампазітара, якія назаўсёды застануцца ў рэпертуары калектыва. Цёпла, узнёсла, пранікнёна, шчыра і ўтульна было ў залі і ў душах прысутных.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** моманты вечара памяці Яўгена Петрашэвіча ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я.Карскага. 11 красавіка 2018 года.




Любіце кнігу,
бо яна –
крыніца мудрасці
ведаў і навукі
лекі для


Дудар гарадзенскага краю


Дудар гарадзенскага краю


Дудар гарадзенскага краю